# *ФИЛОЛОГИЧЕСКИЕ НАУКИ*

## ЛИТЕРАТУРОВЕДЕНИЕ

# *PHILOLOGY*

## LITERARY STUDIES

УДК 821.161.3

**І. С. Крыштоп,** кандыдат філалагічных навук, дацэнт
Установа адукацыі «Баранавіцкі дзяржаўны ўніверсітэт», вул. Войкава, 21,
225404 Баранавічы, Рэспубліка Беларусь, inessa_top@mail.ru

### ДЫЯЛЕКТЫКА ФАКТЫЧНАГА І ІЛЮЗОРНАГА Ў РАМАНЕ ВІКТАРА КАЗЬКО «БУНТ НЕЗАПАТРАБАВАНАГА ПРАХУ»

Мэта дадзенага артыкула — на матэрыяле рамана В. Казько «Бунт незапатрабаванага праху» вызначыць падыходы пісьменніка да мастацкага ўвасаблення дыялектыкі фактычнага і ілюзорнага як асновы матыву пошуку чалавекам сябе сапраўднага, свайго імя і месца ў свеце. Выяўлена, што твор змяшчае глыбокія філасофскія разважанні і складаную этычную канцэпцыю аўтара, якія разгортваюцца на фоне рэалістычных апісанняў штодзённага жыцця. Разам з тым імкненне да праўдзівага адлюстравання жыцця сумяшчаецца ў рамане з аўтарскім роздумам над перспектывамі чалавечага існавання, пры гэтым мінулае, сучаснасць і будучыня перасякаюцца, фарміруючы адметную надчасавую прастору. Акрамя таго, твор насычаны арыгінальнымі параўнаннямі, глыбокім сімвалізмам, містычнымі і фантасмагарыйнымі вобразамі, якія спрыяюць пераходу ад канкрэтна-гістарычных, а часам нават прыватна-асабовых часу і прасторы да касмічных і ў зваротным напрамку. Такім чынам, ілюзія ў рамане разгортваецца на цалкам рацыянальнай аснове.

**Ключавыя словы:** В. Казько; проза; анталагічны статус чалавека; экалагічная праблематыка; матыў пошуку; апакаліптычныя матывы; фантасмагорыя.
Бібліягр.: 10 назваў.

**I. S. Kryshtop,** Ph. D. in Philology, Associate Professor
Institution of Education “Baranavichy State University”, 21 Voykova Str.,
225404 Baranavichy, the Republic of Belarus, inessa_top@mail.ru

### THE DIALECTICS OF THE FACTUAL AND THE ILLUSIVE IN VIKTOR KAZKO’S NOVEL “THE REVOLT OF UNCLAIMED ASHES”

The purpose of this article is to identify V. Kazko’s approaches to the artistic reflection of the dialectics of the factual and the illusive as the basis of the motif of human quest for true self, name and place in the world on the material of the novel “The Revolt of Unclaimed Ashes”. It is proved that the work represents author’s deep philosophical reflections and complex ethical concept which are accompanied by detailed descriptions of everyday life. As well, the Belarusian writer combines the aspiration to a truthful portrayal of life with the reflections of human civilization perspectives. At the same time, past, present and future are closely interconnected creating a unique supratemporal space. Moreover, the text is saturated with deep symbolism, unexpected comparisons, mystical and phantasmagoric images which facilitate the transition from concrete historical and even biographical time and space to the outer space and vice versa. Thus, illusion in the novel unfolds on a quite rational basis.

**Key words:** V. Kazko; prose; human ontological status; ecological problems; motif of quest; apocalyptical motifs; phantasmagoria.
Ref.: 10 titles.

**Уводзіны.** Віктар Казько — адзін з сучасных пісьменнікаў, проза якога вызначаецца «ўскладнёнасцю канцэптуальнага пошуку» [1, с. 729]. З самага пачатку свайго творчага шляху Віктар Апанасавіч імкнуўся асэнсаваць лёс не толькі беларусаў, але і чалавецтва ў цэлым. Пры гэтым апавяданні, аповесці і раманы мастака слова цесна пераплецены з абставінамі асабістага

© Крыштоп І. С., 2025

Рэпазіторый БарДУ

жыцця: аўтабіяграфічнасць яскрава праяўляецца ў творах «Цвіце на Палессі груша», «Суд у Слабадзе», «Неруш», «Хроніка дзетдомаўскага саду», «Выратуй і памілуй нас, чорны бусел». Не стаў выключэннем і раман «Бунт незапатрабаванага праху».

У гэтым творы аўтар спалучыў багаты ўласны досвед і пісьменніцкае майстэрства, глыбокі псіхалагізм і філасофскі роздум пры даследаванні актуальных праблем сучаснасці, сярод якіх цэнтральнае месца занялі пытанні аб стасунках чалавека з навакольным светам. Экалагічную праблематыку В. Казько дапаўняе біблейскімі матывамі, элементамі сусветна вядомых міфаў і нацыянальных легенд, тым самым сцвярджаючы неабходнасць уключэння гістарычнага вопыту ў сучаснае быццё. Значнымі для мастацкага свету пісьменніка з'яўляюцца «пэўная абстрагаванасць сітуацыі, сюжэтна-вобразная абагульненасць, што сведчыць пра наяўнасць іншасказальнай і сімвалічнай плыняў» [2, с. 233].

У дадзеным артыкуле вырашаецца задача вызначыць падыходы В. Казько да мастацкага ўвасаблення дыялектыкі фактычнага і ілюзорнага як асновы матыву пошуку чалавекам сябе сапраўднага, свайго імя і месца ў свеце.

**Матэрыялы і метады даследавання.** Матэрыялам даследавання выступіў раман В. Казько «Бунт незапатрабаванага праху» (2000), у якім на прыкладзе жыцця галоўнага героя і яго сям'і аўтар асэнсоўвае сутнасныя рысы чалавека і ўмовы яго існавання на мяжы ХХ—ХХІ стагоддзяў. Метадалогія даследавання заснавана на прынцыпах кантэкстнага і псіхалагічнага падыходаў, апісальнага, біяграфічнага і герменеўтычнага метадаў.

**Вынікі даследавання і іх абмеркаванне.** Нельга не пагадзіцца з думкай Ц. Мортана, што «пісаць пра экалогію — значыць пісаць пра грамадства. <...> Гістарычныя ўмовы знішчылі пазасацыяльную прыроду» [3, с. 44]. Гэтая ідэя выразна прадстаўлена ў рамане В. Казько «Бунт незапатрабаванага праху»: у ім тэхнагенная аварыя, што перакроіла лёсы многіх беларусаў напрыканцы ХХ стагоддзя, становіцца фонам для мастацкага даследавання цывілізацыйнай катастрофы.

Спроба беларускага пісьменніка разабрацца ў прычынах экалагічнай трагедыі выяўляе перш за ўсё складаныя экзістэнцыяльныя праблемы, якія чалавек не ў сілах вырашыць, так як знаходзіцца перад вечным выбарам — асабістае ці грамадскае, магчымае або неабходнае, рэальнае ці выдуманае. Г. М. Кісліцына ўдакладняе: «Сучасны чалавек асуджаны на хістанні паміж разнастайнымі варыянтамі выбару і нарматыўнасцю, што вядзе да разарванасці чалавечай свядомасці. Пераадолець гэты разрыў можна альбо пошукам сябе па-за нарматыўнай сацыяльнай рэальнасцю, або зрастаннем, прымірэннем з ёй» [4, с. 57].

Вобраз сучасніка становіцца цэнтральным у рамане «Бунт незапатрабаванага праху». Аўтар пачынае з рэфлексіі над анталагічным статусам чалавека, таму першая глава, акрамя апісанняў побытавых падрабязнасцей жыцця галоўнага героя Германна Говара, уключае рытарычныя пытанні і разважанні: *«Ён узяў падушку і замёр на імгненне, прыслухоўваючыся, як шамаціць у смецеправодзе за сцяною выкінутае кімсьці з суседзяў смецце. <...> Каму і навошта ўсё гэта трэба? І ці сапраўды на гэтым свеце нешта і некаму трэба»* [5, с. 6, 17]. Відавочна, што адпраўным пунктам мастацкага даследавання асобы сучасніка з'яўляецца сфакусаванасць на праявах адзіноты, разгубленасці і маральнай спустошанасці, падставамі якіх выступіла ў тым ліку і тэхнагенная аварыя, што здарылася на тэрыторыі Беларусі ў 1986 годзе *«якраз у вербную нядзелю перад Вялікаднем»* [5, с. 10].

На працягу рамана імёны і мянушкі Германна Гаўрылавіча Гомана змяняюцца, акцэнтуючы яго трансфармацыю, у тым ліку і на глыбока асабовым узроўні, пад уплывам прынцыпова рэальна-штодзённых жыццёвых абставін. Так, галоўны герой робіць шлях ад Георгія (па пашпарце) праз Жору—Юру—Герку—Германа—Макрыяна да Германна, аднак не заўсёды можна дакладна вызначыць напрамак пераўтварэнняў. Як тлумачыць Т. М. Тарасава, «у творы беларускага мастака шлях да першакрыніцы, да каранёў як першай прыступкі самапазнання пачынаецца з імёнаў герояў. Менавіта ў імені выяўляецца экзістэнцыяльная сутнасць чалавека, яго духоўныя крыніцы. Праз імя асоба паказвае свету сваю самасць, індывідуальнасць» [6].

Рэпазіторый БарДУ

Больш таго, хрышчэнне героя новымі імёнамі адлюстроўвае тэндэнцыю, звязаную з выяўленнем у рамане рубежнасці эпохі, калі, па словах А. І. Белай, «ламаюцца сацыяльныя, палітычныя асновы, а чалавек шукае духоўнага апірышча» [7, с. 14], мае месца «сутыкненне сэнсаў, супрацьстаянне каштоўнасцей, трансфармацыя пазнавальнага ў непазнавальнае» [8, с. 276]. Увогуле перыяд часу на мяжы XX—XXI стагоддзяў абраны пісьменнікам не выпадкова: дзеянне рамана адбываецца ў той самы момант, калі ўсё вакол пачынае мяняцца. Адпаведна, узмацняецца імкненне чалавека да новага разумення сябе і свету нават па-за межамі рэчаіснасці.

На працягу даволі доўгага перыяду — больш за 30 гадоў — Германн спазнаваў сябе з розных бакоў: ён сталеў, працаваў, ажаніўся, святкаваў, падарожнічаў, пакідаў Радзіму і вяртаўся да яе. Аднак раптам да яго прыходзіць *«адчуваненне сэнсу імгнення»*, што вымушае *«адкрыцца, расплюшчыць вочы»* [5, с. 10]. Выкліканае аварыяй на ЧАЭС эмацыйнае ўзрушэнне прыводзіць да трансфармацыі свядомасці Говара, з’яўленню абвостранага ўспрымання свету і асаблівага бачання глыбінных асноў быцця, пільнага разгляду ўнутранага свету чалавека. Больш таго, з дапамогай трапных характарыстык грамадства, якія спалучаюцца з апісаннямі штодзённых побытавых з’яў, аўтар надзвычай таленавіта апісвае роспач і адчай ў душы галоўнага героя: *«Недзе ў душы ён ўсведамляў, што гэта — вар’яцкая скруха ці скруха вар’ята, яе бясконцасць і адначасова хуткаплыннасць»* [5, с. 9].

У якасці першапрычыны асабовага крызісу, сацыяльных адхіленняў і экалагічнай катастрофы В. Казько называе нясталасць чалавецтва, прадстаўнікі якога нават вызначаюцца як «людзі-імгненні»: ім не стае памяці роду і маральнай трываласці, спагадлівасці і чалавечай цеплыні. Пісьменнік удакладняе: *«…патрэбна зусім інакшае, новае мысленне, да якого чалавек дваццатага стагоддзя яшчэ не падрыхтаваны. І сам чалавек у сваім стагоддзі наўрад ці з’яўляецца чалавекам»* [5, с. 237]. Асобна трэба адзначыць, што роздумам пра жыццё падчас катастрофы твор пачынаецца (*«І плата была празмернай для яго. Не прывык ён сплочваць па такіх рахунках. І зусім не яго — чужыя гэта былі рахункі і грахі. Хаця, хто ведае, хто ведае…»*[5, с. 9]) і завяршаецца (*«…чалавеку варта забараніць рабіць хоць што-небудзь дзеля чалавецтва»* [5, с. 262]). Такім чынам, аўтар нібы знітоўвае свае разважанні ў адзінае кола.

Для рамана «Бунт незапатрабаванага праху» характэрна высокая ступень асацыятыўнасці, што дасягаецца праз фрагментацыю. З аднаго боку, аўтар як быццам забываецца на падзеі, якія апісваліся ў папярэднім абзацы, і ўжо ў іншым стане свядомасці галоўны герой працягвае разважаць пра тое, што яго хвалюе. З другога боку, «плынь свядомасці» ў творы фарміруецца вакол сукупнасці важных для існавання асобнага чалавека, якія «рассыпаны» ў розных фрагментах тэксту ісцін. Напрыклад, для галоўнага героя ў адзін сэнсава-асацыятыўны рад паўстаюць камячкі ў маннай кашы, жаночыя грудзі, лета, мяцеліца, чырвоныя рукавічкі каханай жанчыны або зязюліны слёзкі, асфальт, дзень, рыбіна, радасць, душ, кашуля, сэрца. Гэтая мастацкая стратэгія сведчыць пра майстэрства пісьменніка «з выверанай сэнсавай дакладнасцю рабіць канцэптуальна-змястоўныя пераходы з аднаго плана на другі» [2, с. 287]. Акрамя таго, яна цалкам спрыяе намеру адлюстраваць дысгармонію свету, акцэнтаваць прыкметы хаосу, стварыць атмасферу няпэўнасці і няўстойлівасці, разгубленасці і прадчування катастрофы.

З дапамогай шматлікіх сімвалаў, разгорнутых параўнанняў і трапных метафар В. Казько сцвярджае непарыўную сувязь паміж чалавекам і навакольным асяроддзем, таму значнымі для разумення спецыфікі рамана «Бунт незапатрабаванага праху» з’яўляюцца характарыстыкі часу. Адзначым, што аўтар дакладна не вызначае храналогію падзей. З аднаго боку, раманны час паглыбляецца за кошт рэтраспектыўнага плана: на старонках згадваюцца Турава-Пінскае княства і нават часы Адама і Евы. З другога — з дапамогай шэрагу значных рэалій XX стагоддзя (перабудова, карткі, чарга, «Крысціян Дыёр», Разанскі цуд, Сталін, Гагарын, Сібір, Дзень Перамогі, БАМ, Чубайс і г. д.) В. Казько акцэнтуе матэрыяльнасць і надзённасць як свайго героя, так і падзей, што здараюцца вакол яго: *«Пажарамі, паводкамі, стыхійнымі бедствамі і войнамі брала пачатак трэцяе тысячагоддзе, заканчвалася дваццатае стагоддзе»* [5, с. 262]. Больш таго, пласт матэрыяльна-цялеснага жыцця ў сукупнасці з усімі сваімі сэнсамі і светаразуменнем падкрэслівае як адзінства двух светаў — прыроды і чалавека (*«...плоць іх — чалавека, монстра і Зямлі — была адзіная»* [5, с. 10]), — так і іх адвечны антаганізм: прырода стварае, а чалавек

Рэпазіторый БарДУ

знішчае (*«Вар'яцтва спрадвечнае, старое, калі Зямля ўпершыню спарадзіла жыццё, і сённяшняе, калі жыццё імкнулася забіць таго, хто стварыў яго, зямлю»* [5, с. 10]). Таксама трэба адзначыць і дакладнасць В. Казько ў абмалёўцы ўсіх дробязей, што выяўляюць характар мясцовасці: аўтар звяртае ўвагу і на кволую травінку, і на векавечную ліпу, і на пах аеру, і на сіняе неба. У сукупнасці прыродныя і гарадскія ландшафты не толькі дапамагаюць пісьменніку «падсвяціць» інтымныя і экзістэнцыяльныя перажыванні героя, але і робяцца фонам для выяўлення вострых сацыяльных праблем, бязлітаснага ўплыву навукова-тэхнічнага прагрэсу.

Будучыню ў творы фарміруюць матывы папярэджання і прароцтва аб наступствах «цывілізаванай» дзейнасці чалавека: *«Прыйдзе, прыспее яшчэ дзень і час, калі некаму і недзе будзе хаваць нябожчыкаў сваіх. Перакуліцца, перавернецца неба, упадзе на зямлю зорка. І будзе чалавек сцерагчыся чалавека»* [5, с. 80—81]. Цікавым варыянтам рэалізацыі матыву папярэджання з'яўляецца крык, які Германн спачатку чуе ад жонкі, потым ад іншых, а пасля разумее, што так *«застагнала сама зямля. І скуголіла, енчыла…»* [5, с. 26]. Як слушна адзначае М. Тычына, «раман В. Казько "Бунт незапатрабаванага праху" нагадвае знакамітую карціну Эдварда Мунка "Крык"... На фоне абстрактнай урбаністычнай прасторы намаляваная ў профіль галава мужчыны, які крычыць аб тым, што ўбачыў наперадзе і аб чым хоча папярэдзіць усіх, хто яшчэ не заўважае небяспекі» [9, с. 336]. Відавочна, што В. Казько мае на мэце не толькі супрацьпаставіць бясконцасць і штодзённасць, але і прымусіць людзей задумацца над жыццём, якое, на думку пісьменніка, рызыкуе канчаткова пераўтварыцца ў *«няспынны бег на месцы па ўласным паскудстве і брыдоце»* [5, с. 12].

Варта адзначыць, што раману В. Казько «Бунт незапатрабаванага праху» уласціва асаблівае ўзаемапранікненне прасторы і часу: апавяданне лёгка перамяшчаецца з аднаго часава-прасторавага кола ў іншае, таму нават герой не заўсёды ўсведамляе сваё становішча: *«Германн не ведаў, няздольны быў адказаць, куды ён трапіў — у мінулае ці будучае, чаго стаў сведкам»* [5, с. 81]. Акрамя таго, спецыфіку рамана вызначае створаная свядомасцю і падсвядомасцю галоўнага героя "анірычная прастора" 'онирическое пространство' (тэрмін Г. Башляра [10, с. 251]), якая фарміруецца на аснове фантасмагорый, элементаў перакуленай рэальнасці, сноў, зрокавых і гукавых галюцынацый, што ў сваю чаргу разбіваюць *«застаялую ачмуранасць нашага быцця»* [5, с. 10]. Таксама супрацьпастаўленне штодзённага і «тагасветнага» спрыяе пераўтварэнню галоўнага героя амаль кожную ноч у монстра, пачвару, чорны цень, сапраўднага звера, драпежніка, валацужнага сабаку, якога *«немагчыма ні адстрэліць, ні ўлагодзіць, бо ён сам быў народжаны ў яго жахлівых снах…з яго памяці, з пакутліва салодкіх, пачутых яшчэ ў дзяцінстве казак ды паданняў»* [5, с. 8]. У якасці прычыны метамарфоз называюцца *«народжаная ўласнымі фантасмагорыямі»* [5, с. 13] адзінота і супярэчнасці, што складаюць самую сутнасць чалавека на працягу ўсяго яго існавання. Як адзначае аўтар, *«фантасмагорыя і ява сыходзяцца і састыкоўваюцца, і на іх стыку нараджаецца такое, што ў вар'яцкім сне не сасніш: монстры — людзі і звяры са мностам рук, ног, галоў і вачэй, ці зусім невідушчыя, нешта накшталт студзеню, як гэта было на зямлі на пачатку яе існавання»* [5, с. 81]. Такім чынам, у творы мае месца расшчапленне галоўнага героя на рэальнага чалавека з досыць канкрэтнымі біяграфічнымі дадзенымі і жыццёвымі абставінамі і істоту, здольную выйсці праз падсвядомасць, памяць і пачуцці за межы рэчаіснасці і паглядзець на стан рэчаў аб'ектыўна.

Таксама з дапамогай ілюзорнага ў рамане актуалізуюцца і апакаліптычныя матывы. Напрыклад, галоўнаму герою бачылася алавяна-мёртвае вока сажалкавай вады, чуліся плач і стогны зямлі. Акрамя таго, парушэнне лагічных сувязяў у мастацкім тэксце толькі паглыбляе адчуванне невядомасці і пагрозы, выкліканых не заўсёды разумнай дзейнасцю чалавека.

**Заключэнне.** Дыялектыка фактычнага і ілюзорнага ў рамане «Бунт незапатрабаванага праху» выкрывае страшны факт «меліярацыі» чалавечай душы. В. Казько, як і многія яго сучаснікі, напрыклад, В. Быкаў, І. Шамякін, В. Карамазаў, зазначае, што разбуральныя ўчынкі чалавека, узаемная нецярпімасць і/ці варожасць адзін да аднаго могуць прывесці не толькі да знішчэння чалавечага роду, але і наогул да знікнення жыцця на планеце Зямля.

Рэпазіторый БарДУ

Малюючы партрэт сучаснасці, беларускі пісьменнік стварае шматгранны мастацкі свет, які і спрыяе сузіранню, і стымулюе да разважання: твор утрымлівае прыкметы прыроднай, сацыяльнай, маральна-этычнай рэчаіснасці мяжы XX—XXI стагоддзяў, аднак В. Казько пашырае мастацкую прастору праз зварот да філасофскіх меркаванняў і культуралагічных ацэнак. Такім чынам, ад канкрэтных рэалій аўтар уздымаецца да агульначалавечых праблем, не пакідаючы ўбаку нацыяльны ўзровень. Больш таго, факты гістарычнага мінулага далучаюцца да аналізу сацыяльных працэсаў і ўнутранага свету чалавека. Адпаведна, ілюзія ў рамане разгортваецца на цалкам рацыянальнай аснове, якая прадстаўлена трыма складнікамі: нацыянальна-культурным (сукупнасць геаграфічных, нацыянальных, культурных, гістарычных фактаў), сацыяльна-бытавым (грамадства), індывідуальным (штодзённая дзейнасць і свядомасць асобнага чалавека).

**Спіс цытаваных крыніц**

1. Гісторыя беларускай літаратуры XX стагоддзя : у 4 т. / НАН Беларусі, Адз-не гуманітар. навук і мастацтваў, Ін-т літ. імя Я. Купалы ; навук. рэд. У. В. Гніламёдаў, С. С. Лаўшук. — Мінск : Беларус. навука, 2002. — Т. 4, кн. 1 : 1966—1985 / У. В. Гніламёдаў, В. П. Жураўлёў, В. В. Зуёнак [і інш.]. — 2002. — 928 с.

2. *Дубашынскі, Р. Ю.* Праблема характару ў творах Віктара Казько : спецыфіка мастацкага інструментарыю / Р. Ю. Дубашынскі // Беларуская літаратурная класіка і сучаснасць : праблемы характаралогіі / В. П. Жураўлёў [і інш.] ; навук. рэд. В. П. Жураўлёў ; Нац. акад. навук Беларусі, Цэнтр даслед. беларус. культуры, мовы і літ., Ін-т мовы і літ. імя Якуба Коласа і Янкі Купалы. — Мінск : Беларус. навука, 2013. — С. 232—307.

3. *Мортон, Т.* Экокритика / Т. Мортон // VERSUS. — 2022. — Т. 2, № 4. — С. 34—61.

4. *Кісліцына, Г. М.* Сучаснік у люстэрку літаратуразнаўства / Г. М. Кісліціына // Адлюстраванне сучаснай Беларусі ў мастацкай літаратуры : зб. навук. арт. / уклад. Н. В. Якавенка ; навук. рэд. І. В. Саверчанка ; рэдкал.: А. А. Каваленя [і інш.]. — Мінск : Беларус. навука, 2020. — С. 52—58.

5. *Казько, В.* Бунт незапатрабаванага праху : раман / В. Казько. — Мінск : Маст. літ., 2013. — 287 с.

6. *Тарасава, Т.* Дыялектыка чалавечага «я» ў творах В. Казько («Выратуй і памілуй нас, чорны бусел») і М. Уэльбека («Элементарныя часціцы») / Т. Тарасава // Репозиторий БГПУ. — URL: https://elib.bspu.by/-bitstream/doc/2030/1/Дыялектыка%20чалавечага.pdf (дата звароту: 12.05.2025).

7. *Белая, А. І.* Абрысы роднага. Нацыянальныя локусы культуры ў беларускай прозе «эпохі рубяжа» : манаграфія / А. І. Белая. — Баранавічы : БарДУ, 2015. — 206 с.

8. *Кривцун, О. А.* Эстетика / О. А. Кривцун. — М. : Аспект Пресс, 2003. — 447 с.

9. *Тычына, М.* Скарга непачутага крыку / М. Тычына // Бунт незапатрабаванага праху / В. Казько. — Мінск : І. П. Логвінаў, 2009. — С. 327—336.

10. *Визгин, В. П.* Эпистемология Гастона Башляра и история науки / В. П. Визгин. — М., 1996. — 263 с.

Паступіў у рэдакцыю 25.06.2025.

Репозиторий БарГУ